Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

**Серыя «З гісторыі прадпрыемстваў горада»**

# ХЛЕБ НАШ НАДЗЁННЫ

***Да 85-годдзя з часу заснавання ААТ «Берасцейскі пекар» Кобрынскі хлебазавод***

***Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне***

Кобрын
2024

УДК 016:664.66(05+476.7)
ББК 91.9:65.298.11(4Беи)
Х55

Серыя заснавана ў 2019 годзе

***Складальнік***
бібліёграф I катэгорыі цэнтральнай раённай бібліятэкі
*С. Д. Курачук*

Х55 **Хлеб наш надзённы** : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 85-годдзя з часу заснавання ААТ «Берасцейскі пекар» Кобрынскі хлебазавод / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; складальнік С. Д. Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2024. – 56 с. : фат. – (Серыя «З гісторыі прадпрыемстваў горада»).

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Хлеб наш надзённы» з серыі «З гісторыі прадпрыемстваў горада» дае магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй заснавання і сённяшнім днём Кобрынскага хлебазавода. Паказальнік адрасаваны ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца яго гісторыяй, культурай, эканомікай.

**УДК 016:664.66(05+476.7)**
**ББК 91.9:65.298.11(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, 2024

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Хлеб наш надзённы» з серыі «З гісторыі прадпрыемстваў горада» падрыхтавана да 85-гoддзя з часу заснавання ААТ «Берасцейскі пекар» Кобрынскі хлебазавод.

Прадукцыя Кобрынскага хлебазавода ў рэкламе не мае патрэбы. У любой краме вы абавязкова знойдзеце хлебны аддзел, а ў ім - вырабы кобрынскіх хлебапёкаў. У асартыменце як прадукцыя, якая прайшла праверку часам, так і навінкі, якія з'яўляюцца штогод і заваёўваюць сэрцы пакупнікоў. Па сваёй значнасці гэта прадпрыемства, бадай, самае галоўнае і самае неабходнае ў нашым горадзе. На ім выпякаецца хлеб, які на нашым стале — усяму галава.

Кобрынскі хлебазавод - гэта стабільнае вытворчае прадпрыемства, асноўнай мэтай якога з’яўляецца выпуск высакаякаснай прадукцыі, здольнай задавальняць пакупны попыт насельніцтва горада і раёна.

Выданне мае наступную структуру:

Ад складальніка;
Вытокі Кобрынскага хлебазавода;
На шляху да новага завода;
Кіраўнік, патрыёт, чалавек. М. К. Напрэеў;
Крочачы ў нагу з часам;
Традыцыі, якасць, інавацыі;
Спіс крыніц;

Спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

Паказальнік уключае больш за 150 крыніц. Творы друку згрупаваны па відах. Кнігі размешчаны ў алфавіце аўтараў, назваў кніг, артыкулы – па гадах у зваротнай храналогіі, унутры года – у алфавіце аўтараў, загалоўкаў. Уключаны артыкулы з перыядычных выданняў, пачынаючы з 1981 года. Для раскрыцця зместу пры неабходнасці да запісаў даюцца кароткія даведачныя анатацыі. Адбор літаратуры завершаны ў чэрвені 2024 года. Даведачны апарат прадстаўлены алфавітным спісам перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

У выданні выкарыстаны фотаздымкі з фотагалерэі цэнтральнай раённай бібліятэкі, а таксама з сайта ААТ «Берасцейскі пекар» Кобрынскі хлебазавод, іншых адкрытых інтэрнэт-крыніц.

Паказальнік адрасаваны ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца яго гісторыяй, культурай, эканомікай.

# ВЫТОКІ КОБРЫНСКАГА ЗАВОДА

Традыцыі хлебапячэння на Кобрыншчыне сыходзяць сваімі каранямі ў мінулае.

Вытокі Кобрынскага хлебазавода бяруць свой пачатак з 1939 года. У архіўным фондзе «Палескае ваяводскае ўпраўленне» ўстановы «Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці» змяшчаецца інфармацыя аб тым, што ў 1921-1939 гадах на тэрыторыі Кобрынскага павета функцыянавала 16 прыватных пякарняў. Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР многія з іх былі зачынены або нацыяналізаваны.

Ва ўпраўленне Кобрынскага хлебакамбіната ўвайшло тры пякарні. Адна з іх размяшчалася па вуліцы Легіёнаў (з 1939 года і да гэтага часу гэта вуліца Савецкая).





Другая размяшчалася па вуліцы 3 мая, якая з 1939 года стала называцца Першамайскай.

Трэцяя пякарня размяшчалася па вуліцы Ратненскай (з 1941 гэта вуліца стала называцца Інтэрнацыянальнай).





У маі 1947 года дырэктарам упраўлення хлебапякарань быў назначаны Мікалай Васільевіч Гугаеў.

25 студзеня 1951 года выканкамам Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў працоўных было прынята рашэнне аб аб'яднанні Кобрынскага хлебакамбіната з Кобрынскім райхарчкамбінатам у Кобрынскі райхарчкамбінат.

Для прадпрыемства быў выдзелены ўчастак з даўгабудам у цэнтры жылога квартала па вуліцы Матросава, 8. Завяршыць будаўніцтва, якое было распачата яшчэ да вайны і будавалася гаспадарчым спосабам без праектнай дакументацыі, удалося толькі ў 1954 годзе.

Першым дырэктарам Кобрынскага хлебазавода быў Міхаіл Сямёнавіч Абразцоў.



*М.С.Абразцоў*

Так пачалася гісторыя Кобрынскага хлебазавода. Прадпрыемства выраблял да 30 тон хлебапрадукцыі ў суткі. Попыт на хлеб быў вельмі вялікі, і ў 1955 годзе былі пашыраны вытворчыя плошчы. Увайшоў у строй булачны цэх, у якім была ўстаноўлена яшчэ адна печ на 20 люлек (раней было дзве печы на 20 люлек), затым быў пабудаваны будынак прахадной.

У 1962 годзе на пасаду дырэктара райхарчкамбіната прызначаны Аляксандр Пятровіч Кузняцоў, пад кіраўніцтвам якога да механізаванай пякарні былі прыбудаваны склады для сыравіны і вытворчая кацельня. У 1970 годзе пякарня была газіфікавана, пасля чаго ў ёй усталявалі два паравыя катлы.

З развіццём раённага цэнтра і ростам колькасці насельніцтва горада магутнасцей пякарні было недастаткова для забеспячэння Кобрына хлебнай прадукцыяй. 30 тон хлебабулачных вырабаў, якія выпускаліся на прадпрыемстве за суткі, ужо не хапала, а габарыты вытворчага будынка не дазвалялі размясціць тэхналагічнае абсталяванне для стварэння паўнавартаснага вытворчага працэсу. Наспела рашэнне пашыраць плошчу прадпрыемства.

# НА ШЛЯХУ ДА НОВАГА ЗАВОДА

4 студзеня 1963 года на пасяджэнні выканкама Кобрынскага гарадскога Савета дэпутатаў была разгледжана прапанова Кобрынскага райхарчкамбіната аб выдзяленні зямельнага ўчастка плошчай 4 га пад будаўніцтва тыпавога хлебазавода магутнасцю 60 т за суткі. Першапачаткова месцам будаўніцтва вызначалася загарадная тэрыторыя па адрасе: Владаўская шаша, 85 (цяперашняя вуліца Дзяржынскага). Праз тры месяцы на падставе акта камісіі па падборы зямельнага ўчастка гэтае рашэнне было перагледжана. Згодна з новай пастановай пад будаўніцтва быў выдзелены зямельны ўчастак плошчай 4 га з зямельнага фонду саўгаса «Патрыкі» па вуліцы Савецкая, 120 (цяперашняя вуліца Савецкая, 130). Аднак будаўнічыя работы пачаліся не адразу. Прадпрыемства ў Кобрыне не раз змяняла назвы і падпарадкаванасць.



16 жніўня 1966 года рашэннем Брэсцкага аблвыканкама Кобрынскі райхарчкамбінат быў перайменаваны ў Кобрынскі хлебакамбінат.



*Л. І. Кадышын*

У 1972 годзе на пасаду дырэктара хлебакамбіната быў назначаны Леанід Іванавіч Кадышын.

У красавіку 1976 года створана Брэсцкае вытворчае аб'яднанне пякарнай прамысловасці, у склад якога ўвайшоў Кобрынскі хлебакамбінат. 13 красавіка 1976 года ён быў перайменаваны ў Кобрынскі хлебазавод з пазбаўленнем юрыдычнай самастойнасці.

У ліпені 1985 года Кобрынскі выканаўчы камітэт выходзіць на абласны ўзровень з просьбай зацвердзіць і ўзгадніць месца размяшчэння зямельнага ўчастка для будаўніцтва новага хлебазавода і дазволіць правесці на выдзеленым участку праектна-пошукавыя работы. У 1986 годзе на падставе тэхніка-эканамічных разлікаў вызначана неабходнасць і мэтазгоднасць будаўніцтва новага хлебазавода.

У маі 1989 года пачалося яго будаўніцтва, якое курыраваў Мікалай Напрэеў, прызначаны на пасаду намесніка дырэктара завода. Завод стаў для яго сапраўды любімай справай, і ўсю сваю энергію і творчы патэнцыял ён накіраваў на яго росквіт.

10 мая 1989 года Мікалай Канстанцінавіч Напрэеў быў назначаны дырэктарам хлебазавода.



У склад дырэкцыі новага вытворчага прадпрыемства ўвайшло пяць чалавек: дырэктар завода Мікалай Напрэеў, інжынер па тэхнаглядзе Віктар Гараднік, галоўны механік Андрэй Палунін, галоўны энергетык Васілій Грыцук, галоўны інжынер Аляксандр Хамук.



31 снежня 1992 года быў падпісаны дзяржаўны акт прыёмкі новага Кобрынскага хлебазавода магутнасцю 65 т хлебабулачных вырабаў, 1 т кандытарскіх і 1,5 т сухарных вырабаў за суткі.



14 студзеня 1993 года першыя партыі хлеба адправіліся да спажыўцоў.





Былі абсталяваны два асноўныя цэхі: хлебабулачны і кандытарскі, а таксама дапаможныя тэхнічныя службы. На заводзе працавала пяць ліній: адна - чэшскай вытворчасці, астатнія - айчыннай. З кадрамі праблем не ўзнікла: працоўныя месцы занялі работнікі старога прадпрыемства, ды і ад моладзі, якая жадала працаваць на новым прадпрыемстве, увесь час паступалі заявы ў аддзел кадраў. Прадукцыя пастаўлялася ў Кобрын і раён, Брэст, Драгічынскі, Жабінкаўскі, Камянецкі і Маларыцкі раёны.

9 красавіка 1993 года Брэсцкім вытворчым аб'яднаннем пякарнай прамысловасці «Брэстхлеб-прам» быў падпісаны загад аб ліквідацыі старога хлебазавода. Гэтым загадам прадугледжвалася, што

на перыяд асваення магутнасцей і абсталявання, а таксама выпуску гатовай прадукцыі ліквідаваны хлебазавод лічыць цэхам № 2 новага хлебазавода на чале з начальнікам цэха Леанідам Кадышыным. У канцы 1993 года цэх № 2 на вуліцы Матросава, 8 быў зачынены. Вытворчасць хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў была засяроджана ў адным месцы. Вытворчасць набірала абароты, і акрамя духмянага хлеба і духмяных батонаў у магазіны горада і раёна сталі паступаць кандытарскія вырабы.

У тым жа 1993 годзе было распрацавана і падрыхтавана да выпуску 13 найменняў кандытарскіх вырабаў: бісквітаў, кексаў, тартоў, піражных, коржыкаў, пернікаў, печыва і інш.

Станаўленне хлебазавода праходзіла ў складаных умовах. Як любое новае прадпрыемства, завод перажываў паслябудаўнічую даводку, устараняў недаробкі. І ўсё гэта ва ўмовах паглыбленага крызісу. Тым не менш хлебазавод быў на добрым рахунку. Большасць з 60 найменняў вырабаў трапляла ў гандлёвыя кропкі не толькі Кобрына, але і прылягаючых раёнаў, абласнога цэнтра і карысталася попытам у насельніцтва.

У красавіку 1994 года на плошчы Матросава быў адкрыты фірменны магазін «Каравай», у якім, як і ў краме «Гарачы хлеб», прадстаўлены шырокі асартымент выпускаемай прадукцыі.







У студзені 1999 года пакупнікі ўбачылі на паліцах крам круглыя апетытныя буханкі жытняга хлеба з новай назвай «Брэсцкі», які вырабляўся з мукі палепшанай якасці. А вось лінія па вытворчасці

любімай усімі «цаглінкі» пасля двух гадоў інтэнсіўнай працы была прыпыненая для правядзення рамонтных прац.



Старшы майстар хлебабулачнага цэха Вера Бялянава.



Слесар Вадзім Макарук наладжвае новую італьянскую лінію.



Сямейны дуэт Галіны і Андрэя Палуніных.





Пекар Наталля Дзем'янюк выпякае смачныя "кірпічыкі".



Вопытны цестамес Алёна Кароль адказвае за непаўторны смак духмянага хлеба.



Заквашчык Вольга Бабенка на вытворчасці.

# КІРАЎНІК, ПАТРЫЁТ, ЧАЛАВЕК

## М. К. Напрэеў



Былы дырэктар Кобрынскага хлебазавода Мікалай Напрэеў рана пайшоў з жыцця, але пакінуў пасля сябе самыя светлыя ўспаміны. Яго ведалі перш за ўсё як самаадданага і адукаванага кіраўніка, які ўсе



сілы, веды ўкладваў у развіццё вытворчасці прадпрыемства. Ён быў кіраўніком, якога паважалі не толькі на Кобрыншчыне, але і ва ўсёй рэспубліцы.

Мікалай Канстанцінавіч не толькі напружана працаваў, але і ўдзяляў вялікую ўвагу арганізацыі вольнага часу. Быў захоплены музыкай, выдатна спяваў і сам іграў на гітары. Захапляўся фізкультурай,

рухавымі гульнямі, і стварыў на базе хлебазавода выдатную валейбольную каманду, якая існуе і па сённяшні дзень.

Шчырую ўсмешку, камунікабельнасць і пазітыўную энергетыку Мікалая Напрэева памятаюць многія. Памятаюць яго за прафесійны падыход да справы, чалавечнасць і чуласць да людзей, рэдкае ўменне сумяшчаць работу са спортам, мастацкай самадзейнасцю. Ён заўсёды імкнуўся шмат паспець і шмат чаго зразумець. Мікалай Канстанцінавіч вельмі любіў жыццё, людзей…

Памяць аб чалавеку, які пакінуў светлы след у гісторыі горада, застаецца жыць. Ужо 19 гадоў запар у памяць пра былога дырэктара Кобрынскага хлебазавода Мікалая Напрэева праходзіць аматарскі турнір па валейболе, штогод збіраючы як моладзь, так і старэйшае пакаленне.

4 мая 2005 года адбылося адкрыццё мемарыяльнай дошкі як даніна памяці былому дырэктару хлебазавода Мікалаю Канстанцінавічу Напрэеву. На дошцы, выкананай з металу, - барэльеф М. К. Напрэева і надпіс «***Напрэеву Мікалаю Канстанцінавічу, дырэктару хлебазавода з 1985–2004: Кіраўніку. Патрыёту. Чалавеку***».

# КРОЧАЧЫ Ў НАГУ З ЧАСАМ

1 лістапада 2001 года Кобрынскі хлебазавод зарэгістраваны як філіял Рэспубліканскага ўнітарнага вытворчага прадпрыемства хлебапякарнай прамысловасці «Брэстхлебпрам» «Кобрынскі хлебазавод» (загад № 115). На паліцах крам з'явіліся палепшаныя гатункі хлеба «Заварны», «Барадзінскі», «Лошыцкі», «Свіслацкі». Ішла падрыхтоўка да выпуску новага белага хлеба «Калач кобрынскі». Да верасня 2002 года кобрынскія хлебапёкі асвоілі ўжо сем найменняў заварнога хлеба, сярод якіх «Жыцейскі новы», «Сузор'е», «Сувораўскі», «Сувораўскі асаблівы», «Траецю», «Нарачанскі», «Старажэўскі».

23 лістапада 2004 года на пасаду дырэктара Кобрынскага хлебазавода ўступіў Аляксандр Паўлавіч Хамук. Прадпрыемства выпускала больш за 40 найменняў прадукцыі на розныя густы. Каб асвоіць выпуск заварной збажыны, на заводзе ажыццявілі рэканструкцыю, а фактычна стварылі новую вытворчасць у дзеючых цэхах. Адраджаючы старажытныя рэцэпты, на прадпрыемстве сталі выпякаць бездражджавы хлеб на



*А.П. Хомук*

натуральнай хмелевай заквасцы, якасць якога адразу ацанілі прыхільнікі здаровага харчавання. Работнікі прадпрыемства дбалі не толькі пра смакавую разнастайнасць прадукцыі, але і пра здароўе пакупнікоў. На заводзе вырабляўся хлеб лячэбна-прафілактычнага прызначэння з ёдаўтрымліваючымі дабаўкамі, дыетычны і дыябетычны хлеб. «Кобрынскі хмелявы» спадабаўся не толькі кобрынчанам. У Маскве на Усерасійскім аглядзе якасці хлеба і хлебабулачных вырабаў у маі 2005 года гэты хлеб атрымаў залаты медаль.

Больш за 19 тон хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў за дзень, каля 30 відаў найменняў рознай смачнай і карыснай прадукцыі - ад прывычнага хлеба і батонаў да тартоў і печыва. З такімі вынікамі сустрэў Кобрынскі хлеба-завод 2010 год.



Па шэрагу найважнейшых паказчыкаў завод стабільна займаў першае месца ў вобласці і паспяхова спраўляўся з дзяржаўнымі заданнямі, а прадукцыя рэгулярна займала самыя высокія месцы на розных прэстыжных конкурсах. Так, на конкурсе «Ласунак-2009» сярэб-раныя ўзнагароды заваявалі хлеб «Ратнікаўскі» і

«Традыцыйны палепшаны», а хлеб «Сувораўскі сувенірны» і торт «Магія раніцы» былі адзначаны на рэспубліканскім конкурсе-дэгустацыі «Густ-2009». Дарэчы, самы вядомы і тытулаваны торт «Магія раніцы» стаў таксама ўладальнікам ганаровага звання «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь».

Падзеяй 2010 года з'явіўся таксама запуск новай лініі па выпуску зацяжнога печыва. Добрае абсталяванне і новыя тэхналогіі не толькі далі магчымасць вырабляць новую прадукцыю, але і сталі добрым задзелам на будучыню. Такога пячэння да Кобрынскага хлебазавода ў краіне не выраблялі.

Пячэнне «Прыма», якое налічвае сёння больш за 10 разнавіднасцей, з часам выйшла і на міжнародныя рубяжы.










30 снежня 2013 года Рэспубліканскае ўнітарнае вытворчае прадпрыемства хлебапякарнай прамысловасці «Брэстхлебпрам» было рэарганізавана шляхам

яго пераўтварэння ў адкрытае акцыянернае таварыства «Берасцейскі пекар», і ўся прадукцыя кобрынскіх хлебапёкаў стала выпускацца пад гэтай маркай.



16 кастрычніка 2019 года паўнамоцтвы дырэктара Кобрынскага хлебазавода перайшлі Аляксандру Мікалаевічу Фаставу, які добра разумеючы, што праца любога прадпрыемства ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі патрабуе пастаяннага ўдасканалення, узяў курс на мадэрнізацыю. На хлебазаводзе паступова ідзе замена абсталявання і печаў, павялічваюцца вытворчыя магутнасці, набываецца тэхніка.

Кобрынскі хлебазавод з'яўляецца самым маладым хлебапякарным прадпрыемствам у вобласці і паспяхова захоўвае свой энергічны запал. Для таго, каб было ўтульна і камфортна працаваць работнікам, тут рэгулярна праводзяцца рамонты, сістэматычна вядзецца работа па абнаўленні абсталявання. Робіцца стаўка на мадэрнізацыю вытворчасці. На прадпрыемстве дзейнічае сістэма менеджменту якасці, якая дазваляе падтрымліваць высокую бяспеку харчовых прадуктаў.

# ТРАДЫЦЫІ, ЯКАСЦЬ, ІНАВАЦЫІ




За час сваёй дзейнасці прадпрыемства неаднаразова змяняла сваю назву. Цяпер гэта філіял ААТ «Берасцейскі пекар» Кобрынскі хлебазавод. Прадпрыемства выпускае высакаякасную прадукцыю, якая задавальняе пакупны попыт насельніцтва горада і раёна. Кобрынскія хлебапёкі заваёўваюць пакупнікоў якасцю і навізной. Натуральная сыравіна і мінімальная колькасць дабавак робяць прадукцыю хлебазавода канкурэнтаздольнай.

Высокая якасць прадукцыі Кобрынскага хлебазавода дазваляе вытрымліваць канкурэнцыю сярод вялікай колькасці аналагічных прадпрыемстваў.

Філіял ААТ «Берасцейскі пекар» Кобрынскі хлебазавод штогод удзельнічае ў рэспубліканскіх аглядах якасці хлебабулачных вырабаў. Прадукцыя кобрынскіх хлебапёкаў неаднаразова станавілася прызёрам і пераможцам прэстыжных у краіне конкурсаў. Цяпло, з якім супрацоўнікі Кобрынскага хлебазавода ставяцца да сваёй працы, стала асновай выдатных вынікаў прадпрыемства. Хлебабулачныя і кандытарскія вырабы сістэматычна атрымліваюць узнагароды на рэспубліканскіх і міжнародных выстаўках і конкурсах. Не толькі торты, але і іншыя віды прадукцыі заваявалі давер пакупнікоў і высокую адзнаку кампетэнтнага журы. Аб гэтым яскрава сведчаць шматлікія граматы, дыпломы, медалі і кубкі.






Шмат разоў Кобрынскі хлебазавод прымаў удзел у конкурсе «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь», дзе яго прадукцыя станавілася лаўрэатам.

Калектыў пастаянна абнаўляецца маладымі кадрамі. Разам з гэтым сфарміраваны касцяк з тых, хто прысвяціў заводу не адзін год. Ёсць і працоўныя дынастыі, для якіх вытворчасць хлеба - сэнс жыцця. У сяброўскай атмасферы інстытута настаўніцтва нараджаюцца новыя ідэі стварэння мучных пачастункаў.

Добрыя ўмовы працы і адпачынку, дбайныя адносіны да пенсіянераў - усё гэта дае свой плён. На прадпрыемстве работнікам і членам іх сем'яў створаны неабходныя ўмовы для занятку спортам, далучэння іх да культуры. Каб працаваць было весялей і зручней, наладжана культурна-масавая і спартыўная работа. Работнікі хлебазавода займаюць актыўную жыццёвую пазіцыю – прымаюць удзел у спартыўных і культурна-масавых мерапрыемствах як завода, так і горада.




Каманда прадпрыемства ўдзельнічае ў круглагадовай спартакіядзе КФК прадпрыемстваў і арганізацый

Кобрына: у спаборніцтвах па міні-футболе, валейболе, шахматах, гіравым спорце і г. д.

Валейбольная каманда прадпрыемства з'яўляецца лепшай у горадзе і раёне. Неаднаразова яна паднімалася на п'едэстал гонару ў розных спаборніцтвах.





Сёння Кобрынскі хлебазавод - гэта стабільнае вытворчае прадпрыемства, якое пастаянна ўдасканальваецца і ідзе ў нагу з часам, мае вялікі патэнцыял.

Штогод павялічваюцца аб'ёмы вытворчасці і тэмп рэалізацыі ўласнай прадукцыі, пашыраецца кліенцкая база, распрацоўваюцца новыя асартыментныя пазіцыі.

Сярэдняя выпрацоўка завода на сённяшні дзень складае 20 тон хлебабулачных вырабаў і 2,2 тоны кандытарскіх вырабаў. Фірменная гандлёвая сетка прадпрыемства налічвае дзевяць магазінаў. Хлебабулачныя вырабы прадстаўлены падавым, пшанічным і жытнім хлябам, здобнай і булачнай прадукцыяй. Шырокі асартымент кандытарскіх вырабаў: тартоў, піpожных, пернікаў, печыва, мучных прысмакаў. Толькі печыва зацяжное прадстаўлена 20 відамі.

Прадукцыя завода пастаўляецца па ўсёй Брэсцкай вобласці. Аўтапарк прадпрыемства налічвае 23 адзінкі службовага транспарта. На прадпрыемстве працуе 279 чалавек, сярэдні ўзрост калектыву 44 гады.

На Кобрынскім хлебазаводзе пастаянна ўкараняюцца новыя тэхналогіі, што дае магчымасць павышаць прадукцыйнасць працы, паляпшаць якасць выпускаемай прадукцыі, павялічваць асартымент. Асноўная мэта прадпрыемства - выпуск высакаякаснай прадукцыі, здольнай задавальняць пакупны попыт насельніцтва Кобрына і раёна.

# Галоўны паказчык прадукцыі кобрынскіх хлебапёкаў – якасць




Без духмянага хлеба, апетытнага пірага і салодкага мучнога дэсерту нельга ўявіць наша жыццё. Аб тым, каб кобрынскія спажыўцы атрымлівалі самы свежы і смачны хлеб, дбаюць 279 работнікаў завода. Кожны з іх укладвае часцінку душы ў гэты працэс. Можа, таму хлеб кобрынскага завода на магазінных паліцах не затрымліваецца? Пакуль пакупнікі аддаюць перавагу праверанай гадамі прадукцыі, хлебапёкі не стамляюцца здзіўляць новай рэцэптурай і асартыментам.

# СПІС КРЫНІЦ

**Хомук, А. П.** Кобринский хлебозавод / А. П. Хомук // Регионы Беларуси : энциклопедия. В. 7 т. Т. 1 Брестская область : в 2 кн. – Минск, 2009. – Кн. 1. – С. 482.

**Кобрынскі** хлебазавод // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 410. – (З гісторыі прадпрыемстваў Кобрына).

**Гречко, Н. М.** Совершенствование мотивации и стимулирования труда работников в организации : [на примере РУПП «Брестхлебпром» Кобринский хлебозавод] / Ю. С. Хвисюк ; науч. рук. Д. В. Куземкин // Материалы VI международной молодежной научно-практической конференции «Научный потенциал молодежи - будущему Беларуси» : Полесский государственный университет, г. Пинск, Республика Беларусь, 6 апреля 2012 г. / Полесский государственный университет. - Ч. 2. - С. 222-224. - Пинск, 2012.

**Его Величество** Хлеб : [о предприятиях и людях ОАО «Берестейский пекарь» / составитель В. Н. Ситуха ; фото: Ю. Я. Маркарчук, Н. Р. Леоновец, В. И. Свиридович]. — Брест : Альтернатива, 2014. - 99 с. : цв. ил.

**Негруца, В. Б.** Экономическое и социальное развитие союзных республик / В. Б. Негруца, С. П. Иванов. – Москва : «Экономика», 1986. – 94 с.

См. на с. 57.

**Хлебозавод** : [буклет]. – Минск : Полымя, 1987.

**Юбілейныя** даты прадпрыемстваў і ўстаноў горада і раёна. Філіялу адкрытага акцыянернага таварыства «Берасцейскі пекар» Кобрынскі хлебазавод (1954) – 70 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская РЦБС, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 139.

**Белов, Д.** Работать на совесть, не оставаться в стороне от проблем / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2024. – 9 сакавіка (№ 10). — С. 4 : фот.

На базе Кобринского хлебозавода состоялась встреча с трудовым коллективом председателя Кобринского райисполкома А. Пачко.

**Белов, Д.** Спортивным традициям быть / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2023. — 22 сакавіка (№ 21). — С. 8 : фот.

Состоялся традиционный турнир по волейболу памяти бывшего директора Кобринского хлебозавода Николая Напреева.

**Елизарова, Ж.** Вкусные цветы с ароматом победы / Жанна Елизарова ; фото из архива участников конкурса // Кобрынскі веснік. - 2023. — 16 снежня (№ 72). — С. 14 : фот.

Кондитеры филиала ОАО «Берестейский пекарь» Кобринского хлебозавода Лариса Бокатюк и Анна Володенко получили серебро на международном конкурсе.

**Елизарова, Ж.** Душистый «кирпичик», румяный батон / Жанна Елизарова ; фото: Павел Дмитриев, Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2023. — 18 лістапада (№ 68). — С. 7 : фот.

Филиал ОАО «Берестейский пекарь» Кобринский хлебозавод знаменит своими хлебобулочными изделиями.

**Елизарова, Ж.** Искусство создавать хлеб / Жанна Елизарова ; фото: Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2023. — 22 ліпеня (№ 51). — С. 6 : фот.

О работе филиала ОАО «Берестейский пекарь» Кобринский хлебозавод.

**Елизарова, Ж.** Каравай для хлеборобов / Жанна Елизарова ; фото из архива Ларисы Бокатюк // Кобрынскі веснік. - 2023. — 16 верасня (№ 59). — С. 6 : фот.

По итогам онлайн-голосования каравай кондитера филиала ОАО «Берестейский пекарь» Кобринский хлебозавод Ларисы Бокатюк признан лучшим.

**Елизарова, Ж**. По пути хлеба / Жанна Елизарова ; фото: Жанна Елизарова и из архива Кобринского хлебозавода // Кобрынскі веснік. - 2023. — 2 снежня (№ 70). — С. 8 : фот.

О работе филиала ОАО «Берестейский пекарь» Кобринский хлебозавод.

**Елизарова, Ж.** «ТЕККИ КРЕКЕРС» — чемпион вкуса / Жанна Елизарова ; фото из архива Кобринского хлебозавода // Кобрынскі веснік. - 2023. — 17 чэрвеня (№ 44). — С. 8 : фот.

Печенье Кобринского хлебозавода удостоено звания «Чемпион вкуса — 2023» и отмечено дипломом I степени на 33-й Международной специализированной выставке «Белагро - 2023».

**Елизарова, Ж.** Туристическое счастье кобринских хлебопеков / Жанна Елизарова ; фото: Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2023. — 1 ліпеня (№ 48). — С. 16 : фот.

Команда Кобринского хлебозавода заняла первое место областного туристического слета команд филиалов ОАО «Берестейский пекарь».

**Елизарова, Ж.** Чемпионы вкуса / Жанна Елизарова ; фото: Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2023. — 21 чэрвеня (№ 45). — С. 1, 3 : фот.

Кобринский хлебозавод выпускает высококачественную продукцию, способную удовлетворять покупательский спрос населения Кобрина и района.

**Мельник, Р. В.** Александр Пачко: «Сохранить и приумножить то, что имеем» / Роман Мельник ; фото: Роман Мельник // Кобрынскі веснік. - 2023. — 23 верасня (№ 60). — С. 5 : фот.

В ходе Единого дня информирования Александр Пачко посетил филиал ОАО «Берестейский пекарь» Кобринский хлебозавод.

**#Равнение** на героев. О тех, чьи руки пахнут хлебом / подготовила Жанна Елизарова по материалам Кобринского военно-исторического музея им. А. В. Суворова, Кобринской центральной районной библиотеки // Кобрынскі веснік. - 2023. - 19 жніўня (№ 55). – С. 14-15 : фот.

История образования Кобринского хлебозавода.

**Елизарова, Ж.** Вкусно и полезно / Жанна Елизарова ; фото: Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2022. — 16 красавіка (№ 28). — С. 1, 4 : фот.

О работе филиала ОАО «Берестейский пекарь» Кобринский хлебозавод.

**Елизарова, Ж.** У России и Беларуси единая история и единое будущее / Жанна Елизарова ; фото из архива Павла Дмитриева // Кобрынскі веснік. - 2022. — 5 кастрычніка (№ 76). — С. 5 : фот.

Секретарь первичной организации ОО «БРСМ» филиала ОАО «Берестейский пекарь» Кобринский хлебозавод Павел Дмитриев принимал участие в международной патриотической акции в составе делегации Брестской области.

**Детское** печенье «Дочки-сыночки» // Кобрин-информ. - 2021. — 18 ноября (№ 46). — С. 2 : фот.

Детское печенье «Дочки-сыночки» ОАО «Берестейский пекарь» Кобринский хлебозавод удостоено Гран-при на республиканском смотре качества хлебобулочных и кондитерских изделий «Смакота-2021».

**Мануйлик, М.** Хлеб вашему дому / Марина Мануйлик ; фото из архива предприятия // 7 дней. - 2021. — 29 апреля - 5 мая (№ 17). — С. 16 : фот.

На Кобринском хлебозаводе увеличивают производство и реализацию хлебобулочных изделий.

**Пашкович, Л. В.** Единство молодежи — сила Беларуси / Людмила Пашкович ; фото из архива РК ОО «БРСМ» // Кобрынскі веснік. - 2021. — 25 жніўня (№ 67). — С. 4 : фот.

Первый секретарь Кобринского районного комитета ОО «БРСМ» М. Бондарук и инженер Кобринского хлебозавода П. Дмитриев приняли участие в работе 44-го съезда ОО «БРСМ».

**Пашкович, Л. В.** Память остается жить / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2021. — 27 сакавіка (№ 25). — С. 4 : фот.

Состоялся международный турнир по волейболу памяти бывшего директора Кобринского хлебозавада Н. К. Напреева.

**Пашкович, Л. В**. Турслет хлебопёков / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2021. - 2 ліпеня (№ 52). - С. 9 : фот.

Команда Кобринского хлебозавода — победитель спартакиады работников ОАО «Берестейский пекарь».

